

Грамадзянскі ФОРУМ

The bulletin is made up on the equipment given by US Information Agency (USIA) №19 (25) 1 – 15 кастрычніка, 2000 г.



ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ ПРАГАЛАСАВАЛА КРЫХУ БОЛЬШ ЗА 40% ВЫБАРНІКАЎ. У МЕНСКУ ЯЎКА ВЫБАРНІКАЎ НА ЎЧАСТКІ З ЦЯЖКАСЬЦЮ ПЕРАВЫСІЛА МЯЖУ Ў 30%

"Выбары ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь", праведзеныя ўладамі 15 кастрычніка, не адбыліся. Беларускія выбарнікі ў большай частцы праігнаравалі выбарчы фарс, які ня мог прынесьці нічога добрага. Ня больш за 45% выбарнікаў, па ацэнцы незалежных назіральнікаў, прыйшло на ўчасткі па ўсёй краіне. У буйных гарадох гэтая лічба склала і таго меней – 30-35%.

Міжнародных назіральнікаў на гэтых "выбарах" не было. Ні водзін з замежнікаў, якія прыехалі на Беларусь па запрашэньню ўладаў, ня мае паўнамоцтваў назіральніка ад парлямэнта сваёй краіны. Толькі дзяржаўная Дума Расеі дала сваім дэпутатам такі мандат. Але калі ў Беларусі і Расеі заключаны "саюз", дык якія ў такім выпадку думцы міжнародныя назіральнікі? Ні водзін з выбарчых участкаў не наведала місыя Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, ні "эўратройка", якія знаходзяцца зараз у Менску па рашэньню міжнародных структураў для вывучэньня сытуацыі ў нашае краіне ў гэты пэрыяд. Прычынаў казаць пра міжнароднае прызнаньне "выбараў" няма.

Улады аказаліся абсалютна няздольнымі да такой паразы. Нават на тварах вядучых беларускіх тэленавінаў чыталася разгубленасьць, выкліканая незьяўленьнем галасуючых і адсутнасьцю на ўчастках і ў Цэнтарвыбаркаме супрацоўнікаў місыі БДІПЧ і эўрапейскае "тройкі". А 18 гадзіне было наагул аб'яўлена, што толькі-толькі яўка склала 52%, а ў Менску выбары наагул не адбыліся. Відаць, і ЦВК і тэлебачаньне адразу атрымалі жорсткую "накачку", таму больш чым на 4 гадзіны спынілася асьвятленьне канкрэтных лічбаў, якія да гэтага аб'яўляліся кожныя паўгадзіны. А гэта відавочная прыкмета таго, што ўлада шукае варыянты перапісаць забойныя для сябе лічбы. Нарэшце, а 23 гадзіне было аб'яўлена, што ў сярэднем па краіне яўка склала прыкладна 63% (за выключэньнем Менска, у якім падтасоўка лічбаў вялася да раніцы).

А 24 гадзіне лідэры дэмакратычнае апазыцыі правялі тэрміновую прэсавую канфэрэнцыю, на якой абвесьцілі – колькі чалавек рэальна прыйшло ў Беларусі на выбарчыя ўчасткі 15 кастрычніка. **Высновы незалежных назіральнікаў такія: каля 45% выбарнікаў па ўсёй краіне; каля 35% у гарадох з насельніцтвам больш 50 тысячаў чалавек; крыху больш за 30% у Менску.** І сотні і сотні выпадкаў фальсіфікацыі і падтасовак.

Пра тое, што выбары будуць фальсіфікавацца, а формы прыцягненьня грамадзянаў да ўрнаў будуць самыя непрывабныя, стала відавочным ужо ў 8 гадзінаў 15 хвілінаў 15 кастрычніка, калі адзін зь Менскіх назіральнікаў патэлефанаваў у прэсавы цэнтар Хартыі і паведаміў, што на ягоным участку кабінкі для галасаваньня паставілі ў адным пакоі з буфетам з таннымі прадуктамі.

Далей самыя разнастайныя звесткі аб фальсіфікацыі і нацяжках ішлі практычна няспынна з усіх канцоў краіны.

У пасёлку Шаркаўшчына Віцебскай вобласьці чыноўнікаў мясцовага выканкама насільна прымусілі ісьці на галасаваньне і паставіць ня толькі свае подпісы на карысьць мясцовага "вэртыкальшчыка", але і прагаласавць за ўсю сям'ю.

На участку №195 у Менску камісыя адмовілася прадастаўляць назіральнікам пратаколы таго, што ў датэрміновым галасаваньні ўзяло ўдзел больш за 90 чалавек.

У дамах на вуліах Асіпенкі, Мендзялеева і шматлікіх іншых у Менску зьявіліся людзі з выбарчымі ўрнамі, якія хадзілі па кватэрах з просьбай прагаласаваць.

У 20, 21, 25, 93 і шматлікіх іншых выбарчых акругах раптам сталі "худзець" сьпісы прыпісаных да ўчасткаў выбарнікаў. Людзей проста выкрэсьлівалі са спісаў.

Працяг на стар. 2

Працяг. Пачатак на стар. 1

І гэтак далей. Абагульняючы, можна апісаць наступны форма фальсіфікацыі:

Хаджэньне па кватэрах з выбарчымі ўрнамі без заяўкі выбарнікаў. Хаджэньне з урнамі выкарыстоўвалася паўсюдна – і ў буйных гарадох і ў рэгіёнах.

Скарачэньне сьпісаў выбарнікаў. Як адзначылі назіральнікі, пасьля 19 гадзінаў, калі стала зразумела, што з цяжкасьцю атрымліваецца пераадолець мяжу яўкі нават у 40%, сьпісы прыпісаных да ўчасткаў выбарнікаў сталі імкліва скарачацца. Так, у Менску, у сярэднім, скарачалася ад 200 да 400 чалавек. А на ўчастку №220 некуды прапалі адразу 800 выбарнікаў, якія лічыліся ў сьпісе да 19 гадзінаў 15 кастрычніка.

Галасаваньне па любых прад'яўленых дакумэнтах – студэнцкіх білетах, альбо пенсійных пасьведчаньнях. Хаця закон строга патрабуе прад'яўленьня пашпарта.

Датэрміновае галасаваньне. Неверагодная лічба амаль у 15% тых, хто быццам бы датэрмінова прагаласаваў (а ў Гарадзенскае вобласьці нават больш за 20%) кажа сама за сябе – такога проста ня можа быць.

Зьнішчэньне чыстых нескарыстаных бюлетэняў адразу пасьля закрыцьця ўчасткаў без прысутнасьці назіральнікаў.

Галасаваньне "за таго хлопца". Шмат хто з гараджанаў прыходзілі галасаваць з пашпартамі ўсёй сям'і. І ім дазвалялі гэта рабіць.

Мабілізацыя "адміністрацыйнага рэсурсу". Па загаду прагаласавалі салдаты і чыноўнікі, студэнты, якія жывуць у інтэрнатах, шматлікія супрацоўнікі дзяржпрадпрыемстваў – тыя, хто непасрэдна залежыць ад дзяржавы. Практычна на кожным прадпрыемстве адзін з намесьнікаў дарэктара адказваў за прымусовае зьяўленьне супрацоўнікаў.

Але нават такое шырокае выкарыстаньне ўсіх гэтых мэтадаў не кампенсавала ўладам незьяўленьне выбарнікаў на ўчасткі для галасаваньня. Як заявілі лідэры дэмакратычных сілаў Беларусі на тэрміновай прэсавай канфэрэнцыі, скліканай а 24 гадзіне 15 кастрычніка, прычыны посьпеху байкота хаваюцца ў тым, што грамадзяне Беларусі прыслухаліся да заклікаў апазыцыі, і тым, што шмат хто згубіў веру ў Лукашэнку, стаміліся ад яго рэжыма і зразумелі, што цяперашнія выбары – гэта фарс, які ня здольны зьмяніць жыцьцё да лепшага.

Па матэрыялах сайта «Хартыя'97»

РАДЫЁ СВАБОДА
BELARUS SERVICE RFE/RL

Аляксандар Лукашэнка пад час галасаваньня адказаў на пытаньні нашага карэспандэнта, датычныя лёсу Дзьмітрыя Завадзкага і Маршу Свабоды.

(Карэспандэнт:) "Як Вы ацэньваеце ўчорашнюю акцыю апазыцыі?"

(Лукашэнка:) "Вінаваты я. Чаму? Таму што я паабяцаў Заходу тры ці чатыры, можа паўгады таму назад, абвесьціўшы пэрыяд даверу, так званы пэрыяд даверу. Я паабяцаў, што мы ніводнага гэтага адмарозка не кранем пальцам... Калі яны ня будуць парушаць закон. Але яны і парушалі закон пастаянна. А вось зараз паглядзім, як адрэагуюць на гэта нашыя назіральнікі міжнародныя, якія прыбылі сюды, што яны скажуць пра нашыя выбары".

(Карэспандэнт:) "Ярмошын нарадзіўся ў Разанскай вобласьці. Тэарэтычна ён можа балятавацца?"

(Лукашэнка:) "Пры чым тут Масква, у нас сталіца Менск. Слухай, ты пабыў у Чэхіі і, па-мойму, забыў нават сталіцу свайё дзяржавы".

(Карэспандэнт:) "Вы мяне там ня бачылі. Я ў Чэхіі ня быў. Маё прозьвішча Сьвірко, Вы мяне са Сьвірыдавым блытаеце".

(Лукашэнка:) "Ну ў Прыбалтыцы недзе там..."

(Карэспандэнт:) "Недзе там..."

(Лукашэнка:) "Так, недзе там. Дык ты ж ведаеш, што Менск – сталіца Беларусі?"

(Карэспандэнт:) "Але Ярмошын па нараджэньні грамадзянін ці не? Як Вы лічыце?"

(Лукашэнка:) "Вы што ня ведаеце біяграфію нашага прэм'ер-міністра?"

(Карэспандэнт:) "Ведаю, таму ў Вас пытаю".

(Лукашэнка:) "Дык што пытаць, калі Вы ведаеце?"

(Карэспандэнт:) "Я ня ведаю, як Вы канстытуцыю трактуеце".

(Лукашэнка:) "Я трактую так, як напісана".

(Карэспандэнт:) "Апошняе маё пытаньне. Сёньня 100 дзён, як зьнік Завадзкі. Вам ёсьць што сказаць з гэтай нагоды?"

(Лукашэнка:) "Я думаю, у Вас ёсьць, у каго спытаць. У вас ёсьць, у каго спытаць. Я ўсё, што хацеў сказаць з гэтай нагоды, я сказаў".

(Карэспандэнт:) "Вы сказалі, што зробіце ўсё, каб яго знайсьці".

(Лукашэнка:) "І мы гэта робім. Я Вам скажу, што Дзіму мы знойдзем, мы знойдзем, нават калі тым, хто яго схаваў далёка, гэта будзе невыгодна. Майце на ўвазе, вы людзі разумныя, слухайце некаторых хаця б на тэлевізіі і рабіце адпаведныя высновы".

Пасьля галасаваньня на ўчастку ля Драздоў Аляксандар Лукашэнка заявіў, што гатовы да непрызнаньня Захадам вынікаў выбараў 15 кастрычніка і ўжо абвесьціў, што будзе пераабраны прэзыдэнтам і ў 2001 годзе. Наш карэспандэнт запісаў пасажы Лукашэнкі і нават задаў яму некалькі пытаньняў.

А 10-й раніцы Аляксандар Лукашэнка наведаў найбліжэйшы да ягонае рэзыдэнцыі "Дразды" выбарчы ўчастак ды прагаласаваў, як ён сказаў, "за патрыёта, які адпавядае" ягонай палітыцы. Атрымліваючы бюлетэнь, ён спытаў жанчыну з выбарчае камісіі — "Вы што, мяне ня ведаеце?", — але ўсё ж паказаў ёй свой пашпарт. Потым спадар Лукашэнка на пытаньне замежнага журналіста пра непрызнаньне гэтых выбараў на Захадзе адказаў гэтак:

(Лукашэнка:) "Байкатаваць выбары – гэта была вялікая памылка тых, хто сёньня змагаецца з Лукашэнкам. Яны проста засталіся на ўзбочыне гэтай дарогі. Гэта гаворыць аб тым, што яны прайграюць і прэзыдэнцкія выбары. Калі б яны ўдзельнічалі ў гэтай кампаніі, дык хутчэй за ўсё яны прайгралі б. Ну дык хоць бы народу нешта паказалі. Ну вось учора паказалі. Сорамна было глядзець. Мне, чэснае слова, сорамна за краіну было, што ў нас хай дзьве-тры тысячы адараваных людзей, але ўсё роўна непрыемна".

Аляксандар Лукашэнка заявіў таксама, што барацьба паміж ім ды апазыцыяй ідзе па лініі яўкі выбаршчыкаў, якую ён прагназуе на ўзроўні 70 адсоткаў, бо, паводле ягоных словаў, беларусы яго ніколі не падводзілі. Таму спадар Лукашэнка ўжо ведае, як паставіцца да непрызнаньня выбараў:

(Лукашэнка:) "У мяне будзе абсалютна спакойная рэакцыя. Непрызнаньне міжнароднымі назіральнікамі выбараў у Беларусі поўнасьцю адкрые твар Захаду перад беларускім народам".

Здзелка, выгадная толькі Лукашэнку

Паводле дакументаў, якія патрапілі ў НАШУ СВАБОДУ з дасведчаных крыніцаў, супраць ідэі пагаднення, прывезенай Аляксандрам Лукашэнкам з Гаваны, выступілі не толькі спецыялісты з мінэканомікі, але і эксперты Гарадзенскага аб'яднання "Азот" і аб'яднання "Беларуськалій". З тым, што страты непазбежныя, таксама згодныя прадстаўнікі канцэрна "Белдзяржхарчпрам" і фірма "Белая Русь", якім давядзецца перапрацоўваць і прадаваць кубінскі цукар. На адмысловай нарадзе ў мінэканоміцы яны ў адзін голас заявілі, што "здзелка эканамічна нявыгадная для Рэспублікі Беларусь".

Спецыялісты даказваюць, што Беларусь страціць ад 3 да 5 мільёнаў долараў. Бо кубінцы прапаноўваюць прадаваць цукар па коштах, значна вышэйшых за сусветныя. 307 долараў за тону, замест 250, як ва ўсім свеце. А яшчэ будуць дадатковыя страты ад дастаўкі кубінскага цукру-сырцу ў Беларусь і яго перапрацоўкі. І нарэшце, няма ўпэўненасці, што цукар з вострава Свабоды сапраўды паставяць у тэрмін, які абяцаюць, паколькі, згодна з канфідэнцыйнай інфармацыяй, ураджай будучага года на Кубе ўжо размеркаваны сярод крэдытораў краіны. Цікава, што пяць гадоў таму пры прэм'еры Міхаілу Чыгіру кубінцы ўжо прапаноўвалі падобны "тавараабмен", але, даведаўшыся, што пастаўкі цукру за ўгнаенні не будуць паралельнымі, Чыгір нават адмовіўся весці з кубінцамі далейшыя перамовы.

Страты ад закупак кубінскага цукру можна было б кампенсаваць продажам на Кубу беларускіх угнаенняў, але аказваецца, што і тут Беларусь чакаюць сюрпрызы. Кубінцы патрабуюць, каб угнаенні былі расфасаваныя ў мяхі яшчэ ў Беларусі. Што значна падвысіць сабекошт.

Другая праблема: Беларусь свае ўласныя патрэбы ў азотных угнаеннях



задавальняе толькі на 60 адсоткаў. А тут давядзецца аддаваць 70 тысячаў тонаў кубінцам і недахоп пакрываць, патраціўшы валюту. Дык навошта такая здзелка, якая прыносіць толькі грашовыя страты і галаўны боль, задаюцца пытаннем у адказных за здзелку міністэрствах, але загад выконваюць.

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»

Ён дадаў, што непрызнаньне выбараў 15 кастрычніка нэгатыўна адаб'ецца на дэмакратычным іміджу Захаду. Хаця ён прызнаў, што эўрапейская "тройка" адзначыла недастатковасьць тых зьменаў, на якія пайшоў перад выбарамі афіцыйны Менск, але тут жа рытарычна спытаў: а дзе дастаткова? І падаў прыклад Вялікае Брытаніі зь ейнымі апошнімі страйкамі. Аднак Аляксандар Лукашэнка падкрэсьліў, што гатовы да непрызнаньня выбараў.

Я запытаў спадара Лукашэнку, як ён ацэньвае дзеяньні сваёй тэлевізіі, што ўвесь час перад галасаваньнем палівала апазыцыю памыямі, ды атрымаў гэткі адказ:

(Лукашэнка:) "Вы ведаеце, трэба было б паглядзець, дзе Вы гэтыя памыі бачылі..."

(Карэспандэнт:) "Фільмы Азаронка ды іншае..."

(Лукашэнка:) "А што, Азаронак фактаў не прыводзіў?"

(Карэспандэнт:) "Якія?"

(Лукашэнка:) "Ня ведаю. Вы ж гаворыце аб Азаронку і пытаеце ў мяне якія. Глядзіце добра".

Таму якія менавіта факты былі ў фільме Азаронка, што выкарыстоўваў кінакадры часу гітлераўскай акупацыі ды перамешваў іх са здымкамі цяперашніх апазыцыйных акцыяў, засталося таямніцаю.

Мабыць, дзякуючы якраз такім паводзінам электронных мас-мэдыяў Аляксандар Лукашэнка ўпэўнены:

(Лукашэнка:) "Тое, што апазыцыя на прэзыдэнцкіх выбарах не пераможа, гэта я магу ўжо сёньня сказаць".

(Карэспандэнт:) "Чаму?"

(Лукашэнка:) "А таму што яна ўжо была пры ўладзе. Наш народ не паўтарае памылак. Яна ўжо была ў пачатку 90-х гадоў – Шушкевіч ды іжэ зь імі".

Спадар Лукашэнка таксама ўпэўнены, што менавіта ён стане прэзыдэнтам у наступным годзе:

(Лукашэнка:) "У нас жа дастаткова людзей талковых, разумных, прыстойных, больш разумных, чым Лукашэнка. Яны, магчыма, зьявяцца, але галоўнае, каб гэта быў чалавек, які любіць свой народ, патрыёт сваёй дзяржавы – вось хто павінен перамагчы. Я за гэта буду перажываць, падтрымліваць буду гэтага чалавека, калі здарыцца так. А наогул чаго вы мяне хаваеце? Не хвалюйцеся! Буду я прэзыдэнтам у 2001 годзе!"

Напярэдадні ягоная прэсавая служба папярэдзіла ўсіх журналістаў, што на ягонае галасаваньне трэба адмыслова акрэдытоўвацца, хоць артыкул 13 Выбарчага кодэксу надае любому журналісту права ў любы час прысутнічаць на любым участку.

Сёньня ўраніцу служба аховы перакрыла цэнтральны ўваход на выбарчы ўчастак Лукашэнкі, таму ўсім журналістам давялося йсьці праз чорны ход пад наглядам целаахоўнікаў. Прадстаўнікі прэсы не маглі, напрыклад, даведацца — за якіх кандыдатаў мог прагаласаваць Лукашэнка, ды колькі выбаршчыкаў зрабілі гэта датэрмінова.

На першым сёньняшнім брыфінгу старшыня Цэнтральнае выбарчае камісіі Лідзія Ярмошына на маю просьбу пракамэнтаваць гэтае парушэньне Выбарчага кодэксу службамі Лукашэнкі фактычна пацьвердзіла, што артыкул 13 пэўны час на згаданым участку ў Акадэміі фізкультуры не выконваўся.

(Ярмошына:) "Мне цяжка сказаць, магчыма, службы бясьпекі на нейкі час перакрылі. Дарэчы, тэлевізія тут жа паведаміла аб колькасьці тых, хто датэрмінова прагаласаваў, таму што гэтая лічба вельмі вялікая. Магчыма гэта тлумачыцца тым, што там галасавалі студэнты інтэрната – каля 39 адсоткаў".

Гэта была Лідзія Ярмошына, старшыня Цэнтравыбаркаму. Яна лічыць, што Выбарчы кодэкс не вызначае, якім уваходам — галоўным або чорным — могуць карыстацца журналісты, таму на ўчастку Аляксандра Лукашэнкі закон нібыта парушаны ня быў.

Юры Сьвірко, Менск Радыё Свабода

Отстаньте от нас!

Борис САМОЙЛОВ
Минск, инженер, 39 лет

"Я — человек законопослушный, и на выборы привык ходить регулярно. Но проходящая избирательная кампания приводит в полный шок. Я может и сам бы вычеркнул многих из кандидатов, но когда за меня это сделали окружные комиссии, то всякое желание идти на выборы отпало. С меня за прошлый месяц взяли одних налогов больше 17 тысяч, да еще в пенсионный фонд — 1.200. Так почему я как исправный налогоплательщик не вправе сам выбрать себе депутата? Кто дал право за меня решать мою жизнь?

Тем более, что достойное существование власть мне совсем не собирается гарантировать. Простой пример. Я воспринимаю возможность пользоваться автомобилем как проявление одной из степеней свободы. А когда 1 литр бензина стоит 500 рублей, то считаю это полным нарушением моих прав как гражданина на свободное перемещение. Разве возможно всю зарплату отдать на заправку старенького "москвича"? У меня дача расположена в ста километрах от города, но добираться туда теперь приходится на общественном транспорте.

Если бы нам честно сказали: "Ребята, потерпите, всем тяжело", — и при этом объяснили честно причины, то, глядишь, мы бы поняли и простили. Но нет, трубят об очередных победах и верности избранного курса. Так и следуйте по нему самостоятельно, а от нас отстаньте! Процентов 70 моих сослуживцев думают так, как я. Те же, у кого в кармане только 300 – 400 рублей на "Крыжачок", будут всегда голосовать за Лукашенко и его сторонников. Человек, покупающий не только вино, но газеты и бензин — голосует совсем по-другому. Поскольку у него есть интересы и способность думать и сравнивать.

Я человек некоренной национальности, и этим все сказано. Когда вижу на стенках за подписью РНЕ "Бей, спасай ...", то меня это не может не задевать. Я живу в Минске на улице Лещинского, там на самом высоком доме РНЕ оставляет свои автографы, и их почему-то никто не закрашивает, а когда внизу кто-то дал характеристику Лукашенко – это сразу же затерли. Та же самая настенная дискуссия разгорелась однажды на школе №201. Звоню директору, спрашиваю, почему не уничтожают антисемитские воззвания? Отвечает — нет денег! Когда появилась надпись против власти — деньги тут же нашлись...

Так вот — не надейтесь, что я за такую власть пойду голосовать!"

По материалам сайта «Наша Свабода»

О счастье

«Посмотрите, как счастливо мы живём!». А теперь отойдите от телевизора!



О демократии

Неправда, что у нас нет демократии. У нас даже тюрьмы самые демократические в мире. Посмотрите, сколько в них сидит демократов!



Жизнь наша - сказка!

Правительство справедливо считает, что оно сделало нашу жизнь сказкой. Но он не замечает, какая же это получилась страшная сказка!



О нашей жизни

Если мы сейчас так хорошо живём, то почему так мало людей об этом знает?



О нашем правительстве

Наше правительство ещё многого не сделало. С всё, что оно не сделало, - к лучшему!



О судьях

Искусство наших судей требует жертв. Демократы жертвуют...



О нас

Неправда, что хорошо там, где нас нет. Просто плохо тут, где мы есть. И где есть уже не за что.

Об уровне жизни

Раз уж наш уровень жизни опустился ниже колена, как говорил наш президент, то не пора ли всем нам опуститься на колени, чтобы дотянуться до него?



Об окружении президента

Неправда, что наш президент далёк от своего окружения. Просто окружение у него недалёкое.



О будущем

Нас уже не радует даже то, что хуже уже быть просто не может.



Высоким чиновникам

Не огорчайтесь, что президент вас не по делу ругает. Зато и хвалит он вас по пустякам...



О питании белорусов

По утверждению нашего президента белорусы по калорийности питания находятся впереди всех стран СНГ и даже, кажется, всего мира. Отчего же тогда продолжительность жизни у нас такая низкая? Неужто белорусы мрут от переедания?



- Когда у власти были коммунисты - колбаса была дешёвая. Сейчас пришли демократы. И дешёвой колбасы не стало. Но скоро к власти снова придут коммунисты. И опять появится дешёвая колбаса.
- Не понял, что они дешёвую колбасу всё время с собой носят?

Лялечны тэатр у Гродне

Памочнік прэзідэнта С.Посахаў агітаваў за сакратара абкома КПБ

Сёння ў вертыкалі няма большага клопату, як "забяспечыць галасаванне". Іншымі словамі — любым чынам загнаць людзей на ўчасткі, каб выбары адбыліся. Хаця, як добра вядома, ва ўсім свеце выканаўчыя ўлады не маюць дачынення да правядзення выбараў, гэта не іхні клопат. У кожнай акрузе сярод кандыдатаў абавязкова ёсць і стаўленікі саміх уладаў.

У Гродна нядаўна прыязджаў прэзідэнцкі памочнік С.Посахаў. Сімвалічна, што выступаў ён у тэатры лялек, куды сабралі кандыдатаў у дэпутаты палаты ды "актыўных выбаршчыкаў". Сп. Посахаў расказаў пра "стратэгію і тактыку" і заклікаў публіку галасаваць за аднаго канкрэтнага кандыдата: "Карыстаючыся гэтай трыбунай, я хацеў бы звярнуць вашую увагу на такога кандыдата ў дэпутаты, як Гірас Георгі Аляксандравіч. Дырэктар буйнога прадпрыемства. Не па чутках ведае аб праблемах эканомікі. Дэпутат Гродзенскага гарадскога савета некалькіх скліканняў. Першы сакратар абкама кампартыі Беларусі. Ён аб'яднаны з іншымі кандыдатамі, якія вылучаныя ад партыі і якія ў фракцыі будучага парламента змогуць прадстаўляць інтарэсы простага народа ўсёй рэспублікі".

Вось такая супер-рэкламная характарыстыка. Хоць сп. Посахаў шмат гадоў пражыў у Гродне, ён, аднак, памыляец-

"Страшылкі" хваравітага хлопчыка



У перапынку матча паміж камандамі Беларусі і Арменіі тэлебачанне паднесла аматарам футбола ідэалагічную "страшылку" ў выглядзе чарговай серыі "Тайных спружынаў палітыкі". Гэтым разам распаленая фантазія рэжысёра Азаронка адштурхнулася ад падзеяў 17 верасня 1939 года. Адкрылася "страшылка" выявамі рускіх багатыроў і маршам "Развітанне славянкі". Жаночы голас з часоў расійскай імперыі клікаў Азаронка ў паход, і пад гэты заклік гледачу паказалі паперку з польскага пасольства, якая нібыта ўтрымлівала просьбу не кранаць тэму верасня 39-га. Зразумела, што просьба краіны, якая імкнецца ў NATO і дала прытулак З.Пазьняку, была бязлітасна адхіленая, і Азаронак абрушыў меч помсты на апазіцыю. Яна была абвінавачаная ў антынародным падыходзе да вызвалення заходніх беларусаў з-пад улады "панскай Польшчы". Было расказана пра здзекі над вязнямі ў Картуз-Бярозе і патлумачана для недасведчанага чалавека, што нібыта гэта першы канцлагер у Еўропе, і сюды прыязджалі Гебельс і Гімлер набірацца вопыту забойстваў. Для Польшчы як краіны, якая страціла ад гітлераўскага нашэсця 6 мільёнаў людзей, такі азаронкаўскі каментар сама меншае цынічны здзек. Услед на экране з'явіўся нейкі палітолаг Сяргееў і панёс лухту пра амерыканскія і заходнія планы вярнуць Еўропе дзяржаўныя межы ўзору 1939 года. Адносна прыбалтыйскіх рэспублік, гэта, на ягоную думку, ужо зробленае. На чарзе Малдова. А беларуская апазіцыя зараз імкнецца аддаць Заходнюю Беларусь Польшчы. Разбурыць гэтыя д'ябальскія задумы можа выключна адно — далучэнне Беларусі да Расіі. Інакш на Беларусь паляцяць амерыканскія бомбы і зямля пакрыецца трупамі, што і было праілюстравана здымкамі з часопісаў. Пасля гэтага Азаронак з пафасам кідаў у нейкую лужыну камяні з нумарамі, што павінна было вобразна адлюстраваць разбуральныя дзеянні "дэмакратаў", лаяў старых людзей, геяў (пэўна, з мэтай зацвердзіць сваё лібідо), ухваляў Сталіна, кпіў з моладзі і паказваў начальству, што не любіць "маршы свабоды", скіраваныя супраць рэжыму.

Творчыя сродкі няшчаснага кінааматара ўбогія, як у таго Гебельса, што прыязджаў у Бярозу: слова праўды – пяць словаў хлусні. Сапраўды, лагер у Бярозе быў страшны. Але гэта не лагер смерці, якіх тысячамі набудаваў Сталін, і ўжо ніяк не Курапаты, дзе савецкія карнікі расстралялі сотні тысячаў невінаватых людзей. Сапраўды, палякі закрывалі цэрквы, але пасля таго, як усе цэрквы былі зачыненыя ў Савецкай Беларусі, а бальшыня святароў расстраляныя ці сасланыя ў лагеры смерці на Поўнач. Сапраўды, у верасні 1939 года ў Заходняй Беларусі людзі сустракалі Чырвоную Армію з надзеяй на лепшае жыццё. Але ўжо ў лютым 1940 цягнікі павезлі ў Сібір і Казахстан першыя 50 тысячаў заходнебеларусаў, а ў красавіку яшчэ 24 тысячы. У тым жа красавіку стралялі ваеннапалонных у Катыні. Сапраўды, межы мяняліся, бо СССР пачала вайну з Фінляндыяй і адхапіла ў яе ладны кавал. Мяняліся і беларускія межы, у 1944 годзе любімы Азаронкам Сталін аддаў Польшчы Беласточчыну. Забыўся расійска-савецкі агітатар і на сумесны савецка-нямецкі парад у Брэсце 25 верасня.

Відочна, што выпуск тэлехлусні прымеркаваны да выбараў. Дзве траціны фільма прысвечаныя менавіта боязі байкоту і абразам дзеячаў апазіцыі, прычым хамскім, з лаянкай, якую дазволіць сабе далёка не кожны пацыент Навінак.

Тое, што Азаронку бог даў мала розуму – не ягоная віна. Тое, што псіхіка ў няшчаснага хворага хлопца скажоная, таксама не ён вінаваты. Але блага, што ТБ эксплуатуе хваравітага чалавека замест таго, каб дапамагчы яму прайсці курс лячэння ў добрым нервовым аддзяленні. Бо беднаму рэжысёру, які, відаць, адчувае сябе ўваскрэслым Алёшам-Паповічам, няўцям, што выглядае ўсё не гэтак герaічна, як яму падаецца ад гукаў расійскага марша. Уражанне, шчыра кажучы, такое, што са сметніка ўзнялася варона, каркнула ва ўсё горла, каб напужаць балельшчыкаў футбола, і шчаслівая вярнулася да пошукаў новай ежы сярод бруду.

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»

ца. Камбінат "Тэамантаж", якім кіруе Г.Гірас, — "гэта, — цытую апошні нумар газеты "Вечерний Гродно",—невялікае прадпрыемства... Літаральна некалькі вытворчых памяшканняў, дзе вырабляюць сцэнічнае абсталяванне". Навошта было прэзідэнцкаму памочніку рабіць са свайго пратэжэ "дырэктара буйнога прадпрыемства"? Тым больш у лялечным тэатры, у якім найлепш ведаюць, што такое "Тэамантаж". Вялікага знаўцу эканомікі рабіць з чалавека, які займаецца ўсяго толькі сцэнічным абсталяваннем тэатраў і дамоў культуры, таксама было наўрад ці мэтазгодна.

Але, як бачым, для Посахава вельмі важна было, што Гірас — першы сакратар афіцыйных камуністаў у Гродзенскай вобласці. Гэта няцяжка зразумець, калі ўлічыць, што адміністрацыя з К.Маркса, 38 па некаторых звестках мела непасрэднае дачыненне да аднаўлення іхняй структуры ў маштабах краіны. Посахаву ўжо наперад нават вядома, што ў палаце будзе асобная фракцыя КПБ. Брава!

Наконт "прадстаўлення інтарэсаў простага народа" таксама ёсць пытанні. У памяці гродзенцаў яшчэ свежы скандал, звязаны з імем таварыша першага сакратара абкама КПБ. Агульны сход працоўнага калектыву "Тэамантажу" сваім часам выдзеліў дырэктару з касы прадпрыемства на асабістае жыллё 14 тысяч долараў. Прычым на вельмі незвычайных умовах. Пагасіць амаль усю пазыку — 87,5% прадпрыемства павінна было само сабе. І толькі астатнія 12,5% сумы абавязвалі вярнуць Г.Гіраса. Прычым на працягу ажно 2 гадоў. На прадпрыемстве, апроч яго самога, тады працавала яшчэ 46 чалавек. Такім чынам, кожны з працаўнікоў па сутнасці скінуўся больш як па 260 долараў дырэктару на кватэру.

Справа трапіла спачатку ў аблвыканкам, а адтуль — у пракуратуру. Было выяўлена, што сп. Гірас меў добрыя жыллёвыя ўмовы. На трох чалавек — вялікую трохпакаёвую кватэру. Але ж прыгожа жыць не забароніш! Атрымаўшы ад роднага прадпрыемства 14 тысяч долараў, даклаўшы да іх яшчэ 4 тысячы, ён набыў на дваіх з жонкай чатырохпакаёвую кватэру агульнай плошчай 82,5 квадратных метраў. А неўзабаве коштам прадпрыемства на новай кватэры быў пастаўлены дырэктару і тэлефон. За яго пазачарговую ўстаноўку рабочым давялося заплаціць яшчэ некалькі соцень долараў.

І, як бачыце, дырэктар застаўся дырэктарам. Ды яшчэ за ягонае абранне ў дэпутаты агітуе сам прэзідэнцкі памочнік! Відавочна, якую публіку жадае бачыць у сваім кішэнным парламенце прэзідэнцкая адміністрацыя.

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»

На хуторе. Без хлеба и гранат.

Итак, избирательная кампания вышла на финиш. Минск засыпан предвыборной макулатурой. Читая ее, понимаешь, как низко упал в нашей стране авторитет высшей законодательной власти. В отсутствие настоящих, сильных и профессионально подкованных кандидатов, достаточно образованных для работы в парламенте, в палатку нынче лезет и клоп, и жаба, и змея. Собственно, ничего удивительного в этом нет. Если уж Лукашенко смог стать президентом, то почему бы Васе Пупкину не стать законодателем в его органе?

Выбора нет, несмотря на изобилие. На каждом избирательном участке присутствует кандидат от власти, иногда слегка закамуфлированный под независимого, иногда откровенно пролукашенковский. Обычно это государственный служащий или государственный бизнесмен. Встречаются всякого рода полковники со стертыми лицами, похожими на заслонки; упитанные директоры каких-то объединений с глазами наподобие пятаков; отупевшие от собственной ненужности и невостребованности депутаты нынешней палатки, которых, однако, почти все избиратели принимают за новичков. Им обычно противостоят случайные люди, выглядящие на своих избирательных листовках как хронические неудачники. Их бледные нездоровые лица свидетельствуют о недоедании и бытовых лишениях, их программы нелепы, их рецепты всеобщего счастья наивны, глупы или агрессивны. Вот, например, корявый православный фундаменталист, церковный предприниматель (!) с Законом Божьим (!) в руке, декларирует духовность, веру и любовь. А также публикует многословный традиционный плач о порушенной вере и отечестве. (Все это еще ничего, если бы фамилия духоборца не была **Черт**ович и если бы он не был широко известен в судебных инстанциях как один из изготовителей человеконенавистнической подлой книжонки "Война по законам подлости"). Вот какой-то усатый человек без опознавательных знаков (кто? откуда? зачем?) ксерокопирует подписи в свою поддержку, среди которых выделяется подпись борца Медведя. Вот "практик, теоретик, организатор, общественный деятель, разработчик и т.д." с положительным, но абсолютно неизвестным публике лицом (угадай, кто я!). Вот милая дама, которой надоело просиживать стулья в затхлой атмосфере своего научно-исследовательского института, обещает, что "если вы на выборах скажете ДА, то ее двери "всегда будут открыты для вас" (какие двери имеются в виду и есть ли за теми дверями муж, дама не уточняет). Вот, в листочке, приклеенном за стеклом аптеки на проспекте, один невыразительный человек, называющий себя экономистом, утверждает, что в страну ввозятся доллары, а вывозятся неисчислимые богатства...

На этом фоне госпожа Абрамова (сама руская, по матери татарка, по фамилии еврейка, с корнями из Ашхабада, страдающая хронической белорусофобией, автор диссертации "Гуманизм насильственной задачи (!) социалистической революции") выглядит настоящим профессионалом уже хотя бы потому, что ее листовка вычитана, грамотно сверстана и отпечатана на лучшей полиграфической базе. Любительство, самодеятельность, примитив, неискренность, стремление к халяве царят сегодня на избирательных участках. И это в столичных округах! Можно представить,что творится на периферии. Каких кандидатов там вынесло на поверхность избирательной кампании? О чем они вещают?

Между тем предвыборная канализация, хотя и с натугой, но открылась и на чикинском телевидении. И оттуда хлынуло! Началось то убогое действо, за необходимость которого так рьяно ратовали коммунисты и отщепенцы демократического лагеря. И что же? Осуществился ли перелом в умах людей после их пламенных выступлений? Увы, перелом не случился, рейтинги их не выросли, зато случились кое-какие сюрпризы. Коммунист Калякин, например, откровенно вляпался в одно произведение местных телехудожников и выглядел на экране полным идиотом в компании не совсем здоровых людей. (У лидера ЛДПБ Гайдукевича хватило ума и здравого смысла избежать этого позора, о чем он потом с радостью и удовольствием рассказывал). Но одна неудача, как известно, настоящего коммуниста остановить не может: ему нужна диалектика. И товарищ Калякин появляется в студии вместе с членами "могучей кучки" Абрамовой и Новосядом, где выглядит предметом интерьера на фоне возбужденной Абрамовой. Мы, кстати, почему-то не услышали от них предполагаемой убийственной критики нынешней власти. Зато в изобилии были оправдания, самооправдания и критика...оппозиции. Зачем, дескать, она не участвует? Так ведь уже много раз было сказано...

Сейчас кандидаты реализуют свое право на трехминутные телевыступления. Их запускают в эфир тогда, когда потенциальные избиратели телевизора еще не смотрят, потому что именно в это время они возвращаются домой после работы или бегают по магазинам в поисках дешевого пропитания. (Я, признаться, тоже не видел ни одного выступления по этой же причине. И не чувствую себя обделенным).

Короче говоря, фантазии по поводу свободного обращения к белорусскому народу при помощи казенного телевидения оказались, как и ожидалось, полностью несостоятельными. И если положить на одну чашу весов все вместе взятые выступления всех бывших оппозиционеров, легших под нынешнюю власть, по БТ, а на другую – одно пятиминутное выступление на ОРТ Шушкевича и Добровольского с призывом бойкотировать выборы, то оно перетянет всех их примерно так, как пудовая гиря перетягивает мешок мух. Другое дело, что выступление по росийскому телеканалу для белорусских демократов — редчайшее событие. И нет сомнений, что эту ложку дегтя в лукашенковскую бочку затем зальют тонной сладкого вранья по поводу выборов в палатку. Уже на следующий день, словно отыгрывая промах своей телекомпании, московский "отзимок", ведущий передачи "Однако" (человек наглый, еще достаточно молодой и не живший взрослым при коммунистах), выпучив глаза, начал пужать публику кознями Америки, восхвалять коммунистические порядки, привычно наврал про демократов, обругал белорусскую оппозицию, вступился за нашего узурпатора и чего-то такое нафантазировал про счастливую жизнь белорусских ученых.

Учитывая то, что этот дегенеративный малый сидит иногда возле Путина и получает инструкции из Кремля, можно предположить, что это и есть официальная точка зрения Москвы на нынешнее положение в Беларуси, стыдливо подаваемая в эфир через "выпученного". Продолжается старая лицемерная политика Кремля. Российская Дума, несмотря на обновление состава, по сути своей осталась прежней, о чем свидетельствует ее последнее заявление по поводу выборов в Беларуси. Путин, на которого некоторые наши политики стали возлагать неоправданные надежды как на просвещенного монарха, просто пудрит мозги Западу своими речами. Возможно, что в

душе он не такой мерзавец и шовинист, как, скажем, некоторые завсегдатаи российских коридоров власти, но он, безусловно, — основная деталь всей алчной, жестокой и подлой имперской государственной системы. И наивно ожидать от него проявлений порядочности или реализации заявленных демократических принципов.

Именно с Путиным связаны тайные планы некоторых кандидатов в депутаты, служащих режима, а также политиков, вылетевших из списков претендентов и называющих себя "третьей силой". Суть их расчетов вот какова: Лукашенко себя исчерпал, его время подходит к концу. Он, кстати, требует слишком многого от Москвы за сдачу суверенитета, высказывает различные претензии, выставляет условия. Нужно собрать дружную банду прилично одетых мерзавцев, состоящую из номенклатурной братии, и продать Родину за одну лишь гарантию власти. А Лукашенко отодвинуть в сторону, на пенсию. Если надо, то поделиться и с ним. Тогда руки развяжутся для приватизации, для легитимизации и получения кредитов на Западе. Приватизацию сделать для себя, кредиты немедленно разворовать по российской технологии, а объединение в одно государство все спишет.

Вот такая у нас нынче политика и такие у нас нынче деятели. Вот откуда все эти попытки расколоть демократическую оппозицию, оболгать ее, обмануть, подставить, обокрасть. Вот откуда эти кандидаты в депутаты с непонятными целями, интриги и предательство. А мы после этого удивляемся, что господин Вик, посторонний человек, который год напряженно трудится над лишением нашей страны суверенитета.

Именно в этом ракурсе рассматривается вопрос о грядущих президентских выборах. Нужен кандидат, который устроил бы Москву и был бы привлекателен в глазах общественности. Все остальное – дело технологии и российских денег. Поэтому попытки продвинуть какого-то кандидата в качестве единственного от демократических сил в обход объединенной оппозиции должны рассматриваться как авантюра, чреватая полной оккупацией страны.

Я не склонен обвинять в подобных злых кознях создателей комитета "Выбор 2001" (г.г. Середича, Грушевого, Нистюка, Шлындикова, Щукина, Погоняйло, Ванину, Подгола), презентация которого состоялась на днях. Более того, я искренне уважаю их всех как людей, неравнодушных к судьбе Родины и много сделавших для нее. Заявленная ими цель – способствовать появлению белорусского Коштуницы вызывает искреннее уважение. Но для чего создавать еще одну общественную структуру, если вся работа будет состоять из подготовки для газет материалов о возможных кандидатах? Может быть комитет нужен, чтобы получить денежную помощь на Западе? Организаторы категорически отвергают это предположение. Тогда остается догадка, что комитет займется поиском денег на Востоке. Остается догадка, что комитет создан под конкретного человека, а вся суета с другими кандидатами – для отвода глаз. Остается догадка, что организаторы хотят присвоить себе право выступать от всей общественности и принимать от ее имени решение. Возникает масса вопросов, на которые пока никто ответить не может. Например, почему, создавая новую структуру, организаторы считают своим долгом откреститься от политических партий, называя себя "представителями общественности", если добрая половина из них члены различных партий?

Особо поразило меня то обстоятельство, что на пресс-конференции, посвященной созданию комитета, его организаторы (а среди них было несколько претендентов на звание кандидата в палату №2) как большой личный успех подавали то обстоятельство, что им удалось собрать несколько десятков тысяч подписей в миллионном городе. Они хвастались этим как большим достижением, хотя каждый из них уже добился в жизни определенного успеха и признания. Господин Середич – талантливый, если не сказать гениальный, редактор газеты для трудящихся масс. Господин Грушевой – непревзойденный профессионал по части оказания гуманитарной помощи пострадавшим от чернобыльской катастрофы. Господин Нистюк – великолепный партийный организатор, человек, который может вежливо объяснить журналистам все, что угодно, за исключением необходимости членам партии идти на эти выборы, и т.д. Во всяком случае эти многократные ссылки на собранные подписи и есть, по-видимому, главный итог участия некоторых политиков в лукашенковских выборах. И вот теперь для сохранения лица им приходится оправдываться, объясняться, упрекать, придумывать комитеты, заострять внимание на пустяках и преувеличивать. Так зачем было огород городить? А ведь еще не вечер. Что там будет после голосования?

Вот, пожалуй, и все. А теперь, читатель, угадай с двух раз: нужны эти выборы лично для тебя или нет?

По материалам сайта «Наша Свабода»

Ранейшай ужо не буду

С. Няўгень, жыхарка Гародні

Ужо час прайшоў, а забыцца не магу пра той дзень, калі я ўпершыню пабывала на грамадскай акцыі пратэсту. У нашай Гародні яны праводзяцца рэдка, ды і па тэлебачанні ад Зімоўскага ўвесь час чую: маўляў, збіраюцца на тыя тусоўкі нейкія «адшчапенцы», «адмарозкі» і г.д. Калі слухаеш дзень пры дні такое, а сам затурканы клопатам пра якую бульбіну ў агародзе і нічога не ведаеш, што дзеецца на свеце, то нахабная хлусня засядае ў галаве.

А 8 кастрычніка, прчытаішы ўлёткі аб «Маршы Свабоды» ў нашым горадзе, я вырашыла пайсці і сама ўсё пабачыць. Прыйшла загадзя на пляц Тызенгаўза, дзе меўся адбыцца мітынг, калі тут амаль нікога яшчэ не было. Затое быў апаратар з тэлекамерай напагатове. Я міжволі звярнула івагу на тое, чым ён займаўся ў чаканні дэманстрантаў. А ён стаў падгаворваць хлопца і дзяўчынку, якія тут, відаць выпадкова праходзілі, затрымацца, прайсціся па пляцы са шклянкамі піва ў руках, прысесці і як след «пабалдзець» перад тэлекамерай. «Майстар праўды» тузаў міжвольных акцёраў-статыстаў туды-сюды - і вось красамоўны кадр «спившихся малолеток» для Рэзананса гатовы! Вечарам па тэлебачанні я яго і глядзела. Толькі ніхто з гледачоў, акрамя мяне, не ведаў, як «варылася» тая брыдота на кухні хлусні.

Так было і з многімі іншымі «праўдзівымі» кадрамі-падтасоікамі: на экране быццам і плошча была паказана амаль пустая - а людзі стаялі на ўсім пляцы і з асуджэннем мітынгоўшчыкаў «народам». Я ж на свае вушы чула ад тых, хто стаяў паблізу, але яшчэ не адважыўся далучыцца да нас: «Якія вы малайцы, не баіцеся!» А адзін хлопец дык рассмяшыў, запэўніўшы самакрытычна, з гумарам: «Я не трус, но я... боюсь!» Мы разам пасмяяліся. Але, веру, у наступны раз і ісці, і стаяць будзем разам сярод аднадумцаў з бел-чырвона-белымі сцягамі.

... Час ідзе, вядзе новыя падзеі. Але той восеньскі дзень, калі я ўпершыню адчула сябе чалавекам сярод людзей і атрасла з сябе путы ліпкай хлусні, даў мне такі зарад духоўнай моцы, што я ўжо ніколі не буду ранейшай.

Па матэрыялах «Народнай Волі»

Польшча - Беларусь. 1:3

Уражанні Эдуарда Малафеева пасля матча.

Аб гульні ў Лодзі.

Тое, што нельга выправіць, з тым трэба мірыцца і хутчэй забываць. Канешне, цяжка псіхалагічна перажываць першую паразу. Але можна сказаць проста – не пашанцавала. Мы гулялі не горш, гэта дакладна. Але палякам дапамаглі родныя сцены і падтрымка трыбунаў. Псіхалогія шмат значыць.

Бачылі вы, як мы прапускалі галы? Тры стандартныя становішчы, тры пенкі варатара і абароны, і ў выніку параза. Вы ж бачылі, мы не адседжваліся ў абароне, і мы будзем гуляць ад атакі і дома і на выездзе, незалежна ад саперніка. Гэта маё крэда.

Толькі не трэба пасыпаць галаву попелам, усё яшчэ наперадзе, і ў гэтым плане вельмі важны матч з Арменіяй. Тут сам Бог загадаў выйграваць, і ўвогуле, аб адзінаццатым кастрычніка можна сказаць "Гэты дзень год корміць".

Аб іграках.

Перажываюць хлопцы, бачна. Канешне, у душу кожнаму не залезеш, але па паводзінах бачу.

Крыўдна, што за дзень перад матчам наш асноўны варатар Гена Туміловіч падвярнуў нагу падчас размiначнай гульні ў баскетбол. Давялося ставіць Віталіка Варывончыка, а той падвёў. Перагарэў, мабыць. Але я ў яго працягваю верыць. Хаця ў даным выпадку лепш бы ўжо Васю Хамутоўскага я паставіў… Васілюк не гуляў так, як гуляюць за зборную. Баранаў Вася не глядзеўся зусім, проста зусім. А галоўнае – незразумела, чаму разгубіліся. Варотам амаль не пагражалі, хаця гэта галоўны кампанент гульні. Фалілі шмат, чым выдавалі сваю разгубленасць. Каюся, памыліўся крыху са складам, мая віна ў паразе. Ды што там, прайграе заўсёды трэнер, выйграваюць жа ігракі. Валік Бялькевіч вось – запас моцы ў хлопца проста вялікі, а ён так і не рэалізоўвае яго на поўную ў зборнай. Можа вяртанне ў склад траўміраванага раней Хацкевіча дапаможа Валянціну. Адну толькі замену ўгадаў – Колю Рындзюка калі выпусціў. Бачылі, які актыўны быў хлопец, гол забіў, а мог запраста і два! Штанюк наступную гульню прапусціць з-за дзвюх картак жоўтых. Можа быць папросім у трэнера "маладзёжкі" Юры Пунтуса Глеба пад замену выпусціць. Але ўвогуле будзем зыходзіць з таго ж складу, толькі варатара зменім дакладна.



Што датычыцца таго, што не пайшлі пасля гульні і не падзякавалі беларускім балельшчыкам, якія прыехалі падтрымаць іх за тысячу кіламетраў, то проста сорамна мусіць ім было. Можа сказаўся недахоп выхавання.

Аб судзействе.

У мяне прынцып: судзейства не абмяркоўваецца, бо нават калі суддзі не правы, яны ўсё роўна правы. Каб не было спакусы спіхваць няўдачы на судзейскі фактар, трэба быць мацней за саперніка. Вунь "маладзёжка" "пахавала" палякаў 4:0, а судзейства там было ўвогуле нікуды не вартае, горш чым у нас.

Аб сапернiках.

Не ўразілі палякі. Мы павінны былі іх абыгрываць. І я думаю, што іх лідэрства цяперашняе – далёка не безумоўнае. Глядзеў гульню Арменія – Украіна, дык там армяне самі вінаватыя, што аддалі украінцам тры ачкі. Яны мусілі іх браць. Пакуль што не разумею, што робіцца з Украінай. Нарвежцы, быццам бы і фаварыты групы, а ўжо два туры запар унічыю бяздарна гуляюць. З Уэльсам толькі на апошніх хвілінах адыграліся. Армянаў жа, я думаю, апасацца асабліва нярварта, у гасцях яны заўсёды слабей, чым дома гуляюць.

Я думаю, будзе настрой, будуць і перамогі, не трэба камплексаваць, усё яшчэ наперадзе.

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»

Расколатая Беларусь, ці прыгоды фанатаў у Польшчы

У самым пачатку гульні на стадыёне "Відзэў", што ў польскім горадзе Лодзь, дзе сустракаліся нацыянальныя каманды Польшчы і Беларусі, у сектары С1 распачалася масавая бойка. І самае цікавае, што адны з самых "незакамплексаваных" у Еўропе лодзенскія фанаты ўдзелу ў гэтай бойцы не прымалі. Тузаніна адбывалася ў сектары беларускіх балельшчыкаў, і беларусы там "мачылі"… іншых беларусаў. Прычына была палітычная, "гопнікам" і скінам не спадабаліся колеры нацыянальных сцягоў, што трымалі ў руках прыехаўшыя пахварэць за Беларусь бізнесоўцы, працоўныя і інтэлігенты. Палякі назіралі за тым, што адбывалася ў беларускім сектары, спачатку з адкрытым ротам, а пасля з апладысментамі і рогатам. Не без дапамогі польскіх паліцыянтаў сектар умоўна падзялілі на дзве часткі, а Беларусь зноў апынулася ў расколатым стане яшчэ напачатку гульні. У знак пратэсту супраць бойкі, ці проста з боязі за сваё здароўе, маладзёжная зборная Беларусі, што прыйшла паглядзець футбол разам з землякамі, перайшла ў польскі сектар…

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»





Бюлетэнь «Грамадзянскі форум».
Заснавальнік:
Рэдакцыя бюлетэня «Грамадзянскі форум».

Выдаецца на беларускай і рускай мове. Перыядычнасць - 2 разы ў месяц.
Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакументацыі. Выдадзена накладам 299 асобнікаў.
Выдадзена пры дабрачыннай падтрымцы Гарадзенскага абласнога грамадскага аб'яднання «Ратуша», Фонда «Альянс Каўнтэрпарт», Камісіі па Дэмакратыі Амбасады ЗША на Беларусі і Нацыянальнага Фонду на карысць дэмакратыі (ЗША).
Адрас для пошты: 231100, Ашмяны-3, а/я 63. E-mail: Civil_Forum@mailru.com